порядочность, моральную чистоту. Научная организация труда дает кадрам дополнительные возможности для эффективной работы, помогает уйти от излишнего бумаготворчества и заседательской суеты, а сосредоточиться на главных вопросах.

Если же сложить это все вместе и добавить к существующей практике, мы вдохнем много новых сил и возможностей, и страна определенно почувствует это в решении сложных задач нашего времени. К тому же названный опыт поистине во всех смыслах бесценный, а способные кадры, как известно, решают все. В последнее время на это постоянно обращает внимание А.Г. Лукашенко при назначении новых кадров руководителей.

**Использованные источники и литература**

1. Бобков, В.А. Беларусь как социально-гуманитарный проект в глобальном мире / /В.А. Бобков // Беларусь в условиях глобализации и интеграции. Материалы Международной научной конференции. – Минск: БНТУ, 2018. – С. 28–45.

2. Беляков, В.К. Организация удесятеряет силы / В.К.Беляков, Н.А.Золотарев – М., 1975, – 190 с.

3. Бобков, В.А. Возрождение духа ленинизма / В.А. Бобков – М.:Политиздат, 1989, – 399 с.

## КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ЎЗ’ЯДНАННЯ З БССР

Багдановіч А. І. г. Мінск, БНТУ

Палітычнныя, эканамічныя і сацыяльныя працэсы, што адбываліся ў Заходняй Беларусі, даследаваны ў айчыннай гістарыяграфіі даволі добра. Горш, на наш погляд, гісторыкамі вывучаліся культурныя працэсы, асабліва ў кароткі прамежак часу з верасня 1939 па чэрвень 1941 г.. У дадзеным артыкуле мы прааналізуем некаторыя аспекты культурнага будаўніцтва ў заходніх абласцях пасля іх ўз’яднання з БССР.

Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы было абумоўлена Рыжскім мірным дагаворам ад 18 сакавіка 1921 г., па якому да Польшчы адышла значная частка заходнебеларускіх зямель

(Гродзенская губерня, усходнія раёны Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерні). Тут пражывала каля 4,7 мільёнаў чалавек, пераважную большасць якіх складалі беларусы. Па Рыжскаму дагавору ўрад Польшчы гарантаваў беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву права на свабоднае развіццё культуры, мовы і адпраўленне рэлігійных абрадаў [1, с. 325]. Аднак гэтыя гарантыі засталіся толькі на паперы. Да 1939 г. былі зачынены амаль усе беларускія школы, спынілася выданне беларускіх газет і часопісаў, забаранялася ўжыванне беларускай мовы ў школах, дзяржаўных установах і органах мясцовага самакіравання.

У адпаведнасці з пактам аб ненападзе паміж СССР і гітлераўскай Германіей ад 23 жніўня 1939 г. [2, с. 3-4] Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна былі прызнаныя сферай інтарэсаў СССР. Гэтыя дакументы, а таксама дагавор аб дружбе і мяжы, падпісаны 28 верасня 1939 г. ужо ў ходзе нападу Германіі на Польшчу [2, с.6-8], аб'ектыўна садзейнічылі аднаўленню нацыянальна-тэрыта-рыяльнай цэласнасці беларускага народа, парушанай Рыжскім мірным дагаворам ад 17 верасня 1939 г., калі германскія войскі падыходзілі да межаў Заходняй Беларусі, а жыццёва важныя цэнтры Польшчы былі ўжо занятыя немцамі, Чырвоная Армія пачала свой вызваленчы паход па тэрыторыях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Да 25 верасня ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі была цалкам занятая савецкімі войскамі.

Людзі сустракалі чырвонаармейцаў хлебам і соллю, прызнаючы ў іх сваіх вызваліцеляў аб чым сведчаць шматлікія дакументы і ўспаміны. Яны пачалі самаарганізоўвацца – выбіраць сялянскія камітэты і мясцовыя саветы, дапамагаць усталеўваць новую ўладу. Асаднікі, паліцыя і польская адміністрацыя былі арыштаваны і раззброены. У гарадах і сельскіх гмінах наладжваліся праца прад-прыемстваў, медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, фарміра-валася новая сістэма адукацыі – ішло адкрыццё школ на беларускай і рускай мовах, забароненых у буржуазнай Польшчы. На далучаных заходніх тэрыторыях былі створаны пяць абласцей: Брэсцкая, Бела-стоцкая, Баранавіцкая, Вілейская і Пінская [3, с. 446].

У першыя ж дні тут разгарнулася актыўнае культурнае будаўніцтва. З усходніх абласцей Беларусі быў накіраваны шматлікі культурны дэсант. У гарадах і вёсках заходніх абласцей былі арганізаваны выступленні шматлікіх творчых калектываў Беларусі.

Так, калектыў Мінскага тэатра юнага гледача з 18 па 28 кастрычніка 1939 г. даў 21 спектакль і 16 канцэртаў на выбарчых участках і ў воінскіх часцях Брэст-Літоўска. У гэты ж перыяд па маршруце Лунінец-Кобрын-Пінск выступаў Палескі драмтэатр з Гомеля. З пастаноўкамі "Тэўе-малочнік" і "Гершэле Астраполер" у Гродне, Беластоку, Пінску і Кобрыне выступілі дзве брыгады яўрэйскага тэатра, якія далі 16 спектакляў. 13 канцэртаў далі сімфанічны аркестр і хор Белдзяржфілармоніі ў Беластоку, Ваўкавыску, Вілейцы і Баранавічах. Самадзейныя калектывы з Рэчыцы і Хойнікаў, мінскіх чыгуначнікаў і чэкістаў складам каля 130 чалавек выступалі ў Беластоку, Лідзе, Ваўкавыску. Дакументы сведчаць аб велізарнай увазе да правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў сярод насельніцтва заходніх абласцей. Не было ніводнага населенага пункта, дзе б не выступалі тады альбо прафесійныя, альбо самадзейныя калектывы.

Новыя гарызонты адкрыла вызваленне Заходняй Беларусі перад вядомым майстрам харавых спеваў Рыгорам Шырмай. Ужо 1 кастрычніка 1939 г. ён атрымаў мандат на стварэнне прафесійнага калектыву. Рыгор Раманавіч згуртаваў вакол сябе таленавітых выканаўцаў, у тым ліку былых удзельнікаў віленскіх хораў, і пачаў мэтанакіраваную працу з імі ў Беластоку. У канцы 1940 г. Беларускі ансамбль песні і танца пад яго кіраўніцтвам выступіў у Мінску, а ў маі 1941 г. – на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, адкуль калектыў пачаў сваё канцэртнае турнэ па Савецкаму Саюзу, ад Калініна да Ташкента. Вайна застала ансамбль у Арле. З гэтага часу і да вызвалення Беларусі ад фашысцкай акупацыі яго доляй сталі выступленні і канцэрты на франтах Вялікай Айчыннай вайны [4, с. 240-241]

Урад БССР прыняў шэраг рашэнняў аб стварэнні розных устаноў культуры і мастацтва. Так, у горадзе Беластоку да 10 студзеня 1940 г. было прапанавана арганізаваць абласную філармонію з сімфанічным аркестрам у складзе 45 чалавек, ансамблем беларускай песні і танца ў складзе 50 чалавек і аддзяленнем Белдзяржэстрады, у Баранавічах – ансамбль цыганскай песні і танца, у Гродне – яўрэйскі тэатр мініяцюры і абласны хор у складзе 35 – 40 чалавек, у Брэсце – аддзяленне Белдзяржсэстрады.

Да пачатку 1940 г. адчынілі свае дзверы навучальныя ўстановы для творчай моладзі, гэта музычнае вучылішча ў Брэсце, музычнае і

мастацкае вучылішчы ў Беластоку а таксама шматлікія музычныя школы ў Баранавічах, Беластоку, Брэсце, Вілейцы, Гродне, Кобрыне, Лідзе, Маладзечне, Пінску, Слоніме. Праца па стварэнню мастацкіх і музычных навучальных установ была даручана Саюзу кампазітараў Беларускай ССР. Брыгада кампазітараў у складзе Аладава, Палонскага, Падкавырава і інш. была камандзіравана ў Заходнюю Беларусь і правяла там сходы і рэгістрацыю музычных работнікаў (кампазітараў, дырыжораў, аркестрантаў, салістаў, інструменталістаў і вакалістаў). Іх намаганнямі ў Беластоку былі арганізаваныя сімфанічны і духавы аркестры, музычная школа, канцэртна-эстрадная група, пяць канцэртных музычных ансамбляў для кіно і рэстаранаў. Былі уладкаваны на часовую працу многія аркестранты, ансамблі і канцэртныя групы.

Гэтая ж брыгада ў Брэсце, Пінску, Гродне арганізавала канцэртныя аркестры (духавыя, сімфанічныя, народных інструментаў), музычныя школы, яўрэйскі харавы ансамбль, выдзеліла сродкі на дапаможнікі і музычныя інструменты, ажыццявіла запіс народных песень для далейшай творчай працы і г.д. [5, спр. 256].

Да 1 лютага 1940 г. былі створаны абласныя драматычныя тэатры: у Беластоку – на беларускай і польскай мовах; у Брэсце – два аблдрамтэатры на рускай і яўрэйскай мове; у Гродне – беларускі аблдрамтэатр і абласны тэатр лялек; у Пінск быў пераведзены Заслаўскі беларускі калгасна-саўгасны тэатр, рэарганізаваны ў аблдрамтэатр; у Баранавічы пераведзены Рагачоўскі беларускі калгасна-саўгасны тэатр, які гэтак жа стаў абласным драматычным тэатрам. Усяго ў гарадах і вёсках Заходняй Беларусі ў передваенныя гады працавалі пяць абласных драматычных тэатраў, 100 кінатэатраў, 92 дамы культуры, 220 бібліятэк.

Мясцовым органам улады – аблвыканкамам заходніх абласцей БССР – і ўпраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР было дадзена даручэнне ўзяць на ўлік і арганізаваць ахову мастацкіх каштоўнасцяў, якія ёсць у былых памешчыцкіх маёнтках, а найбольш каштоўныя прадметы выяўленчага мастацтва, якія знаходзіліся ў былых памешчыцкіх маёнтках, замках і грамадскіх установах, вывезці ў карцінную галерэю БССР у Мінску. У замку Радзівілаў у Нясвіжы было прапанавана арганізаваць гістарычны музей, перадаўшы яго ў вядзенне ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР [5, спр. 254].

Дзеячы культуры з першых дзён усталявання савецкай улады ў Заходніх абласцях Беларусі сталі самастойна ствараць свае саюзы і аб'яднанні. У Беластоку былі створаны оргбюро пісьменнікаў Заходняй Беларусі і аддзяленне беларускай літаратуры, на чале якога стаў вядомы пісьменнік Піліп Пестрак. Па дакладной запісцы старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР М. Лынькова ў ЦК КП(б)Б, у Заходняй Беларусі налічвалася 76 пісьменнікаў, з іх 22 беларусы, двое рускіх, пяцёра палякаў і 47 габрэяў. Палова з іх – бежанцы з этнічнай Польшчы і Вільні. М. Лынькоў даў характарыстыку: Максіму Танку, Піліпу Пестраку, Наталлі Арсеньевай, Эфраіму Кагаоўскаму і шэрагу іншых пісьменнікаў як вельмі таленавітым. Ён звяртаўся ў ЦК КП(б)Б з просьбай аб аказанні дапамогі заходнебеларускім пісьменнікам на суму 101 тысяча 900 рублёў [5, спр. 115]. На жаль, лёс многіх дзеячаў культуры Заходняй Беларусі быў трагічны, што было звязана з сталінскімі рэпрэсіямі, якія пачаліся ў 1940 г.. Па сенняшні дзень яшчэ дакладна не ўстаноўлена колькі іх было арыштавана і выслана ў Сібір на пасяленне або ў канцлагеры.

Матэрыяльнае становішча пісьменнікаў Заходняй Беларусі таксама было вельмі складаным і нават цяжкім. Іх творы амаль не публікаваліся ў буржуазнай Польшчы, Некаторыя з пісьменнікаў, такія як М. Танк, П. Пестрак, за сваю падпольную камуністычную дзейнасць сядзелі ў турме. Але і Савецкай уладай ім была аказана толькі мінімальная дапамога. Тым не менш іх творы адразу ж з'явіліся ў перыядычных выданнях Савецкай Беларусі, што паспрыяла паляпшэнню іх дабрабыту. Ва ўсіх творчых саюзах былі створаны партыйныя арганізацыі, якія адразу ж сталі праводзіцца мерапрыемствы па ідэалагізацыі творчых работнікаў. У Беластоцкае аддзяленне пісьменнікаў прыязджалі выкладчыкі з Мінска і чыталі лекцыі пра сацыялістычны рэалізм, аб адносінах да класічнай спадчыны, аб прынцыпах савецкай крытыкі, аб станоўчым героі ў савецкай літаратуры і г. д. Праца ў Беластоцкім аддзяленні Саюза пісьменнікаў была пастаўлена з размахам, з улікам звыклых для таго часу метадаў палітычнага выхавання: вывучаўся "Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" І. Сталіна, праводзіліся сходы секцый паэтаў і празаікаў, дзе ладзілі чытку новых твораў. Аднак спецыялістаў па сацыялістычнаму рэалізму Беластоцкаму аддзяленню СП БССР відавочна не хапала, і літаральна за некалькі месяцаў да вайны

П. Пестрак звяртаўся да Аляксандра Фадзеева, які быў у той час старшынёй Саюза пісьменнікаў СССР, з просьбай прыслаць адпаведнага лектара. Але ў сувязі з пачаткам вайны Масква не паспела яго накіраваць [4, с. 221].

Такім чынам, культурнае будаўніцтва ў Заходняй Беларусі разгарнулася адразу ж пасля таго, як Чырвоная Армія заняла яе тэрыторыю і вялося па ўсіх напрамках культурнай дзейнасці: навука, адукацыя, літаратура, друк, музыкальнае, тэатрадьнае і выяўленчае мастацтва, кіно, бібліятэчная справа і г.д. Уся культурна-асветніцкая дзейнасць грунтавалася на ідэалагічных прынцыпах сацыялістычнага рэалізму, якія ўжо ўкараніліся і панавалі ва ўсходняй частцы Беларусі. Яны былі зарыентаваныя на выхаванне новага чалавека, адданага ідэалам камуністычнай партыі і перамогі сацыялізму ва ўсім свеце.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983 / А.П. Игнатенко [и др.]; под общ. ред. А.П. Игнатенко – 2 изд. – Минск: Университетское, 1984. – 453 с.

2. Политический архив ХХ века. Секретные документы из особых папок // Вопросы истории. – 1993. – №1. – С. 3 – 22.

3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / рэдкал.: П. Брыгадзін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: РІВШ БДУ, 1995–2002. – Ч. 2: Гісторыя Беларусі ХІХ – ХХ стагоддзі: Курс лекцый / П. Брыгадзін [і інш.]. – 2002. – 656 с.

4. Ершова, Э.Б. Исторические судьбы художественной интеллигенции Белоруссии (1917–1941) / Э.Б. Ершова – Россия молодая, 1994. – 280 с.

5. Пастанаўленні Камітэта па справах мастацтваў БССР. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4. – Вопіс 27. Спр. 254-256.